# Гомельскі універсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 1 (844) | Аўторак, 12 студзеня 1993 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана 1 руб.


## НАВАГОДНЯЕ ВІНШАВАННЕ

29-га снежня 1992 г., калі папярэдні нумар нашай газеты ўжо выйшаў у свет, на адрас рэдакцыі была даслана паштоўка ад былога рэктара ГДУ акадэміка Б. В. Бокуця наступнага зместу:

**«Прашу праз вашу газету сардэчна павіншаваць членаў рэктарата, дэканатаў, усіх выкладчыкаў, студэнтаў, супрацоўнікаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны і вас асабіста з Новым годам. Жадаю ўсім вам вялікіх поспехаў у працы, значных дасягненняў у навуцы, шчасця, добрага здароўя!**

**Акадэмік БОКУЦЬ Б. В.»**

## СА СПРАВАЗДАЧАЙ ВЫСТУПІЎ РЭКТАР

8-га студзеня адбылося пасяджэнне савета універсітэта. На ім заслухана справаздача рэктара члена-карэспандэнта АН Беларусі Л. А. Шамяткова аб рабоце ў 1992 годзе. Яна будзе змешчана ў наступным нумары нашай газеты.

У ходзе справаздачы Л. А. Шамяткоў падзяліўся некаторымі ўражаннямі ад нядаўняй паездкі ў Кітай, выказаў асабістыя меркаванні аб будучым вышэйшай школы ў Беларусі, адказаў на зададзеныя пытанні.

Пры абмеркаванні заслуханай і зацверджанай саветам справаздачы першы прарэктар прафесар М. В. Селькін гаварыў аб неабходнасці ўмацавання працоўнай дысцыпліны, павышэнні адказнасці кожнага члена універсітэцкага калектыву за даручаны ўчастак работы і яе канчатковыя вынікі.

Пасля выступлення старшыні прафкома студэнтаў Н. І. Колтышавай па яе прапанове прынята рашэнне аб стварэнні ва універсітэце Фонда сацыяльнай абароны студэнтаў.

Па інфармацыі начальніка планава-фінансавага аддзела С. Я. Пашук зацверджаны асноўныя напрамкі фінансавання ГДУ.

Прынята рашэнне аб стварэнні і зацвярджэнні на адным з бліжэйшых пасяджэнняў вучонага савета аргкамітэта па падрыхтоўцы да 25-гадовага юбілею нашага універсітэта.

## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

У мінулую пятніцу адбылося пасяджэнне вучонага савета універсітэта. Па дакладу прарэктара па навуковай рабоце прафесара А. М. Сердзюкова разгледжана пытанне аб размеркаванні сродкаў, выдзяляемых з бюджэту Рэспублікі Беларусь, на фінансаванне фундаментальных даследаванняў у 1993 г. па кафедрах і навуковых падраздзяленнях.

На вакантныя пасады выбраны прафесарска-выкладчыцкі састаў.

Вучоны савет зацвердзіў план навукова-даследчых работ на 1993 г. На ім абмеркаваны таксама пытанні аб эфектыўнасці навуковых камандзіровак за мяжу, аб дзейнасці малых і іншых прадпрыемстваў ва універсітэце, па якіх прыняты адпаведныя рашэнні.

## ЧАС СУР'ЁЗНЫ І АДКАЗНЫ

Такі ўжо сёлетні месяц студзень: з самага яго пачатку шмат святочных выхадных дзён. Але святы святамі, а студэнтам цяпер у пэўнай ступені не да іх. Надышоў час зімовай экзаменацыйнай сесіі, а яна, як вядома, патрабуе сканцэнтраванасці, увагі, уседлівасці. І хаця цяпер любая атрыманая ў час экзамена адзнака (канешне, за выключэннем, двойкі) гарантуе атрыманне стыпендыі, гэта не азначае, што рыхтавацца да кожнага чарговага выпрабавання на веды можна не надта старанна, абы слабую тройку атрымаць.







Усё ж матэрыяльны стымул ёсць — наяўнасць толькі чацвёрак і пяцёрак прыносіць пэўную перавагу, дае некалькі дадатковых соцень рублёў у студэнцкі бюджэт.

Калі на многіх факультэтах сесія толькі пачалася і ў экзаменацыйных ведамасцях і заліковых кніжках з'явіліся першыя адзнакі, у пяцікурснікаў эканамічнага факультэта, біяфака, студэнтаў-географаў IV курса, студэнтаў-фізікаў вытворчага патоку выпрабаванне на веды завяршылася. Эканамісты адправіліся на практыку, а біёлагі са спакойнай душой адклалі ў бок падручнікі і канспекты і могуць адпачываць. І для спакою ў студэнтаў груп Б-51 і Б-52 біяфака падставы ёсць: пасля здадзеных двух экзаменаў па спецыяльнасцях імі атрыманы добрыя і выдатныя адзнакі, а здавальняючых — усяго толькі чатыры. Менш удала вытрымалі тры экзамены бягучай сесіі студэнты вытворчага патоку (гр. Б-53). Імі атрымана шмат троек.

Ёсць зрывы на старце і ў першакурснікаў біяфака. Шэсць студэнтаў не змаглі вытрымаць залікі па анатоміі чалавека і замежных мовах і таму не былі дапушчаны да здачы экзаменаў. Ёсць, на жаль, такія ж студэнты і на другім і трэцім курсах. Першыя няўдачы павінны настроіць студэнтаў на больш сур'ёзны і дзелавы лад, якога патрабуе сесія. Час для гэтага яшчэ ёсць. Іншых жа першыя адзнакі ўзрадавалі, абнадзеілі, што дае ім падставу для аптымізму.

Наперадзе ў студэнтаў яшчэ шмат хваляванняў, бяссонных начэй. Пажадаем жа ім усім поспехаў.

**НА ЗДЫМКАХ: выдатную адзнаку атрымала на экзамене па мікрабіялогіі і вірусалогіі, які прымаў выкладчык С. У. Аўсеенка, студэнтка гр. Б-32 Таццяна Валастнова. Веды другакурсніцы Таццяны Радзівановіч дацэнт Ю. А. Праляскоўскі ацаніў на экзамене па арганічнай хіміі добрай адзнакай.**

Фота У. Чысціка.

## ДЗЕЦЯМ — НАШЫ СЭРЦЫ

Для дзяцей, якія вераць у казкі і цуды, свята Новага года — самае жаданае. Раніішнікі і прадстаўленні каля прыгажуні-ёлкі з Дзедам Марозам і Снягуркай, атрыманыя навагоднія падарункі прыносяць ім вельмі вялікую радасць. Але, на жаль, не ўсе хлопчыкі і дзяўчынкі заўсёды маюць магчымасць павесяліцца ў святочным карагодзе каля навагодняй ёлкі. Гэта дзеці-інваліды і хворыя, якія праходзяць лячэнне ў стацыянарных аддзяленнях бальніц рознага профілю, у санаторыях і дыспансерах. Таму напярэдадні Новага, 1993 года праўленне Беларускага дзіцячага фонду звярнулася да ўсіх, каму неабыякавы лёс хворых дзяцей, — да грамадскіх арганізацый, камітэтаў, прадпрымальнікаў творчай і навуковай інтэлігенцыі з заклікам: сэрцам адчуць дзіцячую бяду, знайсці час і магчымасці, каб у калядныя, перадневагоднія дні наведаць хворых дзяцей і ўручыць ім падарункі.

У рамках гэтай рэспубліканскай дабрачыннай акцыі студэнтамі педагагічных спецыяльнасцей нашага універсітэта праведзены шэраг мерапрыемстваў. Так, перад навагоднімі святамі яны арганізавалі і правялі выстаўкі-продажы сувеніраў, цацак, зробленых уласнымі рукамі. Да студэнтаў далучыліся і школьнікі з СШ № 5 і № 44, якія займаюцца ў гуртках мастацкай інкрустацыі саломкай, разьбой па дрэве, і прадставілі тут свае арыгінальныя работы.

Свой важкі ўклад у высакародную справу ўнесла сям'я Кузняцовых: Уладзімір Пятровіч — мастак-афарміцель «Гомельгандальрэкламы» і яго дзеці Алена і Аляксандр — студэнты III курса філалагічнага факультэта ГДУ. Яны прадставілі на выстаўку свае цікавыя работы: пейзажы і малюнкі. Некаторыя з гэтых экспанатаў былі куплены наведвальнікамі выстаўкі, і на выручаныя грошы куплены і ўручаны салодкія ласункі 36-ці хворым дзецям-сіротам, якія знаходзяцца на лячэнні ў псіхіятрычнай бальніцы.

Наведвальнікі выстаўкі раскуплялі таксама прадстаўленыя на ёй кнігі пісьменніка, прэзідэнта Беларускага дзіцячага фонду Уладзіміра Ліпскага «Падкідыш», і выручаныя грошы таксама былі выкарыстаны на набыццё падарункаў хворым дзецям і дзецям-сіротам.

Акрамя гэтага сабраныя студэнтамі самыя разнастайныя падарункі былі ўручаны хлопчыкам і дзяўчынкам на дабрачыннай ёлцы ў СШ № 5 г. Гомеля і выхаванцам Цярухскага дзіцячага дома.

Т. ДУБЯК.

*Навуковыя стажыроўкі*

# У КРАІНЕ З ДЗВЮМЯ НАЗВАМІ

У снежні 1990 года аддзел замежных сувязей Міністэрства народнай адукацыі БССР прапанаваў выслаць дакументы на матэматыка, кандыдата навук, які свабодна валодае англійскай мовай, ва ўзросце да 35 гадоў для магчымай стажыроўкі ў Нідэрландах. Выкарыстаўшы гэтую прапанову, я даслаў свае дакументы спачатку ў Мінск, а затым яны трапілі ў Дзяржаўны камітэт народнай адукацыі СССР, у Маскву. Стажыроўка планавалася ў рамках Праграмы культурнага і навуковага супрацоўніцтва паміж Нідэрландамі і СССР па згодзе паміж Дзяржаўным камітэтам народнай адукацыі СССР і Нідэрландскай арганізацыяй міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне вышэйшай адукацыі (NUFFIC). У сувязі са стварэннем СНД і рэарганізацыяй Дзяржаўнага камітэта народнай адукацыі СССР не толькі спыніўся абмен спецыялістамі, але і перастала існаваць валютнае фінансаванне тых, хто знаходзіўся ў гэты перыяд за мяжой. Таму ўсур'ёз разлічваць на тое, што паездка ў гэты цяжкі час адбудзецца, мне не прыходзілася. У сувязі з гэтым поўнай нечаканасцю стаў ліст з Пасольства Нідэрландаў у Маскве ў канцы мінулага года з запрашэннем мяне на перыяд 9-ці месяцаў з 1 лютага 1992 г. для навуковай стажыроўкі ва універсітэце горада Амстэрдама.

6 ЛЮТАГА ў 14.00 я прыбыў у Шарамецьева-2, а ў 18.45 па маскоўскаму часу быў ужо на борце самалёта Аэрафлота, які выконваў рэйс па маршруту Масква — Амстэрдам.

За гэтай краінай замацаваліся дзве назвы — Галандыя і Нідэрланды. Абедзьве яны — кожная па-свойму — адлюстроўваюць, перш за ўсё, важныя геаграфічныя асаблівасці. Галандыя ў перакладзе на рускую мову — «полая зямля». Сапраўды, многія будынкі, складаючыя стары цэнтр Амстэрдама, пабудаваны на сваях. Другая назва — Нідэрланды — перакладаецца як «нізінная зямля». Краіна займае самую нізкую ў Еўропе частку сушы, трэцяя частка якой нават знаходзіцца ніжэй узроўню мора. Афіцыйная назва краіны — Каралеўства Нідэрландаў, г. зн. каралеўства, якое аб'ядноўвае рад правінцый, якія знаходзяцца на нізінных землях. Што яшчэ я ведаю аб гэтай краіне? Агульнавядомыя паданні і легенды аб ёй і яе жыхарах: пра адважных мараходаў і Лятучага Галандца, аб ветраных млынах і дзіўных галандскіх кветках. Ды яшчэ пра Пятра I, які, здаецца, у канцы 17 ст. ездзіў у Галандыю знаёміцца з суднабудаваннем.

У 23.45 па маскоўскаму часу мы прыбылі ў галоўны аэрапорт краіны — Схіпхол. Нельга не сказаць аб ім хаця б некалькі слоў. Ён знаходзіцца ў некалькіх кіламетрах ад Амстэрдама і даўно ўжо лічыцца адным з буйнейшых у Еўропе. Міжнародная авіятранспартная асацыяцыя неаднаразова прызнавала Схіпхол лепшай паветранай гаванню свету, што высока цэніцца і вельмі прэстыжна. Прычым, цікава не толькі тое, што лепшым прызнаны аэрапорт далёка не самай буйной у свеце дзяржавы, цікавая сама гісторыя яго стварэння. Схіпхол размясціўся на дне былога возера, асушанага галандцамі яшчэ ў мінулым стагоддзі. Геаграфічнае становішча яго вельмі спрыяльнае. З любой кропкі Галандыі дабрацца да яго або даставіць грузы можна лёгка і хутка. Згодна прынятай праграме, да 2000 года плануецца давесці яго прапускную здольнасць да 30 млн. пасажыраў у год.

...Удала мінуўшы зялёны калідор мытні, я апынуўся ў адной з буйных залаў чакання аэрапорту. Па мясцоваму часу было ўжо больш за гадзіну ночы, таму ў залах знаходзіліся толькі рэдкія сустракаючыя. Пастаяўшы некалькі часу каля стойкі з надпісам «Інфармацыя», я зразумеў, што давядзецца разлічваць толькі на свае сілы, ды яшчэ на тыя 100 долараў, якія я прадбачліва наскрэб на дарогу.

Паспрабаваў высветліць у маладой сімпатычнай дзяўчыны, якая сядзела за стойкай, што ж мне рабіць далей. Вось яна — расплата за смела запоўненую графу ў анкеце: англійская мова, свабодна. У такія моманты па-сапраўднаму бачна бездань, якая падзяляе наша савецкае «чытаю і перакладаю са слоўнікам» і звычайнае нармальнае веданне англійскай мовы. Тым не менш, калі вакол ніхто не разумее ні слова па-руску і трэба дзесьці ўладкоўвацца на начлег, англійскія словы прыходзяць самі сабой. Хаця, канешне, маё вымаўленне крыху шакіравала акаляючых і выклікала шматлікія ўсмешкі. Дзяўчына, паглядзеўшы мае дакументы вельмі прафесійна, а галоўнае хутка, знайшла патрэбны мне адрас і нумары тэлефонаў. Але званіць туды ў дзве гадзіны ночы ўжо не мела ніякага сэнсу. Мне з вялікай увагай і спачуваннем растлумачылі, як дабрацца да бліжэйшага, не вельмі дарагога атэля. Прычым за нумар я змог заплаціць прама ў суседняй з «Інфармацыяй» стойцы. Мой атэль знаходзіўся прыкладна ў 10 км ад аэрапорту. На стаянцы «Таксі» было каля дзесятка шыкоўных «Мерседэсаў» апошніх мадэляў, якія мне даводзілася бачыць толькі ў кіно. Цяпер, чакаючы маршрутку мінут 45, я нагледзеўся на іх удосталь. У свой двухмясцовы нумар я трапіў каля 4 гадзін. І, заплаціўшы за ноч усяго 50 долараў, спакойна праспаў да 8 гадзін раніцы.

**А. КАРМАЗІН,**
**прарэктар па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях, кандыдат фізіка-матэматычных навук.**

**(Працяг будзе).**

# СТАНЕ БЛІЗКІМ ЗАМЕЖЖА

Пры Гомельскім гарсавеце створана грамадскае аб'яднанне «Асацыяцыя міжнароднага і гуманітарнага супрацоўніцтва «Інтэргорад». Асноўнай яго мэтай з'яўляецца садзейнічанне развіццю, умацаванню сяброўскіх сувязяў жыхароў нашага абласнога цэнтра, вобласці з гарадамі-пабрацімамі Гомеля — французскім Клермон-Феранам, польскім Радамам, шатландскім Абердзінам. Яе членамі сталі шматлікія грамадскія арганізацыі горада, якія дагэтуль самастойна, паасобку спрабавалі наладжваць сяброўскія кантакты з замежнымі краінамі — асацыяцыі «Дзеці ў бядзе», «Жанчыны за выжыванне», прадпрыемствы Гомеля, сярэднія школы, у якіх вядзецца паглыбленае навучанне замежным мовам, і інш. «Інтэргорад» скаардынуе ўсю іх дзейнасць, адкрые больш шырокія магчымасці для дзелавога і культурнага абмену, умацавання дружбы паміж Гомельшчынай і краінамі далёкага замежжа.

Дзякуючы створанаму аб'яднанню, паглыбяцца, стануць стабільнымі сувязі і з Аўстрыяй, у прыватнасці, зямлёй Фарарлберг. Зусім нядаўна яе пасланцы пабывалі ў Гомелі і ў Палацы культуры будаўнікоў зрабілі запіс на відэаплёнку выступленняў вядомых у нашым горадзе і вобласці творчых калектываў, якія з'яўляюцца членамі асацыяцыі «Інтэргорад». Сярод іх — універсітэцкая народная харавая капэла «Дзянніца» пад кіраўніцтвам М. Казлова. Аўстрыйцаў уразіла высокае выканаўчае майстэрства нашых мастацкіх калектываў, беларускі фальклор. Зроблены запіс будзе паказаны імі на радзіме спецыялістам у жанры музычнага мастацтва, і, магчыма, адтуль у Гомель прыдуць запрашэнні нашым калектывам прыехаць у Аўстрыю, каб пазнаёміцца з творчасцю беларускага народа больш глыбока.

**Т. НІКАЛАЕВА.**

# ГЕАТЭРМАЛЬНАЯ ЭНЕРГІЯ ПОЎДНЯ БЕЛАРУСІ

У апошні час пытанне аб энергетычным забеспячэнні нашай рэспублікі паўстае ўсё з большай вастрынёй. Выказваюцца нават думкі, што ў Беларусі трэба будаваць атамную электрастанцыю. Між тым, як сцвярджаюць беларускія вучоныя, геолагі, у нас ёсць больш бяспечныя крыніцы для задавальнення патрэб Беларусі ў энергіі. Аб тым, што гэта за рэсурсы, расказваецца ў матэрыяле, які прапануецца ўвазе чытачоў.

Паўднёвая частка Гомельскай вобласці ў геалагічных адносінах прадстаўлена Прыпяцкім прагібам. Гэта скіднае паніжэнне крышталічнага фундаменту (граніты), запоўненыя горнымі пародамі асадкавага паходжання. Моцнасць усёй тоўшчы дасягае 5,5—6 км. Пласты горных парод уяўляюць сабой слоісты пірог з пранікальных і непранікальных тоўшч пясчанікаў, вапнякоў, даламітаў, каменных соляў, глін і іншых парод.

Пранікальныя, порыстыя, трэшчынаватыя пароды ўтрымліваюць высокамінералізаваныя водныя растворы соляў (расолы), і ў асобных лавушках — месцанараджэнні нафты. Маюцца два моцныя пранікальныя порыстыя гарызонты: міжсалявы на глыбіні 2000—3000 м з моцнасцю да 500 м.

Мінералізацыя падземных вод указаных вышэй гарызонтаў дасягае 550 г/літр, а тэмпература ў міжсалявой тоўшчы 50—70°C і вышэй, падсалявой — 50—130°C. Самай анамальнай па тэмпературы вобласцю з'яўляецца зона паўночна-ўсходняй часткі Прыпяцкага прагібу. У геаграфічным плане гэта зона з населенымі пунктамі пас. Акцябрскі, Азарычы, Сасновы Бор, Рэчыца, Аляксандраўка. У гэтай зоне на глыбіні 2000 м тэмпература больш 50°C, а на глыбіні 5000 м — больш 115°C.

Зразумела, што энергія вады, нагрэтай да такой тэмпературы, можа быць выкарыстана ў народнай гаспадарцы з мэтай атрымання гарачай вады або электраэнергіі. Але праблема — у атрыманні гэтай энергіі; у распрацоўцы тэхналагічнага ланцужку, які дазваляе рэнтабельна вынаходзіць энергію.

Прасцейшая схема тэхналогіі — гэта пад'ём высокатэмпературных падземных вод на паверхню і далейшая іх перапрацоўка. У гэтым цыкле існуюць цяжкасці. Так, пры пад'ёме высокамінералізаванай вады з вялікіх глыбінь адбываецца змяненне яе тэмпературы і ціску, што прыводзіць да выпадзення з раствору соляў і закупоркі трубапровадаў. У той жа час выдаленне розных соляў з раствору і маючыхся ў іх рэдказямельных элементаў павышае каштоўнасць сыравіны, якая здабываецца. З расолаў можна атрымаць — ёд, бром, літый, цэзій, рубідзій і іншыя элементы.

Другая схема — закачванне ў порысты гарызонт прэсных вод, нагрэў іх і пад'ём на паверхню. У гэтым выпадку рабочая частка асяроддзя падземнага гарызонту будзе прамыта прэснымі водамі і стане выконваць функцыі цеплаабменніка. Рэсурсы падземнай энергіі практычна неабмежаваныя, цеплавы паток падыходзіць з вялікіх глыбінь і неабходна разлічыць аптымальны рэжым цеплааддачы, каб не пераахалоджваць зямныя нетры.

Па ацэнках вучоных воды з тэмпературай 50—70°C могуць быць выкарыстаны для гарачага водазабеспячэння, а з тэмпературай 70—120°C — для буйнамаштабнай цеплафікацыі і электраэнергетыкі. У свеце моцнасць геатэрмальных электрастанцый складае больш пяці мільёнаў кілават, з іх пятая частка ў ЗША, па дзесятай частцы на Філіпінах і ў Італіі.

Тэхналогія атрымання энергіі і хімічнай сыравіны з падземных вод глыбокіх гарызонтаў Прыпяцкага прагібу на сённяшні дзень яшчэ не распрацавана. Але, улічваючы значнасць для нашай рэспублікі вырашэння энергетычнай праблемы і атрымання разнастайнай хімічнай сыравіны, відавочна неабходнасць шырокамаштабных работ для вырашэння даных пытанняў. На наш погляд, неабходна стварэнне некалькіх незалежных навуковых груп для распрацоўкі тэхналогіі выкарыстання хімічных і энергетычных рэсурсаў падземных вод Прыпяцкага прагібу. Трэба таксама разгарнуць маштабныя геатэрмічныя даследаванні для пошуку і разведкі анамальных тэмпературных зон. Не залішне нагадаць, што не так даўно мінеральныя воды ў Беларусь завозілі з Украіны, Каўказа і іншых месц, але пільнае вывучэнне і ацэнка нетраў рэспублікі дазволілі знайсці каштоўныя мінеральныя воды ў розных месцах Беларусі і распрацаваць тэхналогію іх здабычы. А атрыманне харчовай солі на Мазырскім заводзе — добры прыклад канструктыўнага падыходу да рашэння складанай праблемы атрымання хімічнай сыравіны.

Магчымасць выкарыстання падземных вод глыбокіх гарызонтаў Прыпяцкага прагібу ўжо ў цяперашні час і абавязковае іх выкананне ў недалёкім будучым, патрабуе адказнага падыходу да вырашэння такой праблемы, як захаванне шкодных хімічных і радыеактыўных адыходаў шляхам закачкі іх у глыбокія гарызонты.

Ці ёсць прыклады выкарыстання тэрмальных вод у сусветнай практыцы? Так, ёсць. Выкарыстанне тэрмальных вод пры неглыбокім іх заляганні шырока практыкуецца ў Ісландыі, Італіі, на Сахаліне, у Інданэзіі, Новай Зеландыі, на Алясцы і ў іншых рэгіёнах. Нізкатэмпературныя воды з тэмпературай да 70°C выкарыстоўваюцца для ацяплення ў Алма-Аце, Грозным, Цюмені, Омску, Тбілісі і інш. гарадах. Так, у Тбілісі на паверхню выводзіцца тэрмальная вада з глыбіні 2,4 км і тэмпературай 57—65°C. Адна свідравіна забяспечвае вадой мікрараён з 15 тысячамі жыхароў. У Парыжы для цеплазабеспячэння выкарыстоўваюцца падземныя высокамінералізаваныя воды з тэмпературай 75°C на глыбіні 1800 м. У Пекіне для цеплазабеспячэння выкарыстоўваецца больш ста свідравін, у Цяньцзіне — трыста.

Па ўзроўню выкарыстання геатэрмальных рэсурсаў краіны выстройваюцца ў наступны рад: Ісландыя, Венгрыя, Балгарыя, ЗША, Новая Зеландыя, Японія, Італія. У Ісландыі працуюць пяць геатэрмальных электрастанцый, у ЗША — 18. Асноўны аб'ём геатэрмальнай энергіі ў Ісландыі выкарыстоўваецца для цеплафікацыі населеных пунктаў і сельскагаспадарчых аб'ектаў.

Выкарыстанне тэрмальных вод для электра- і цеплазабеспячэння мае істотныя перавагі перад традыцыйнымі крыніцамі энергарэсурсаў. Гэта магчымасць экалагічнай чысціні і невялікага кошту. Магчымасць выкарыстання ў тэхналогіі ўжо прабураных свідравін, размяшчэнне крыніц тэрмальнай энергіі ў прамыслова развітых раёнах і побач з сельскагаспадарчымі аб'ектамі выключае затраты на транспарціроўку энергіі і можа значна знізіць яе кошт. Адна свідравіна можа забяспечваць энергіяй пасёлак у 4—5 тыс. жыхароў.

Выказаныя вышэй меркаванні сведчаць аб тым, што мы не такія бедныя на прыродныя рэсурсы, але такія яшчэ багатыя, што дазваляем сабе не заўважаць свае багацці. І паранейшаму пачнем даказваць неабходнасць будаўніцтва атамнай электрастанцыі, «абсалютную» небяспеку яе новага варыянту, таннасць яе электраэнергіі, не спрабуючы разгледзець усе магчымыя варыянты энергарэсурсаў.

**А. ПІНЧУК,**
**кандыдат геолага-мінералагічных навук, дэкан геафака.**

ЛІДЭР

**Споўнілася 54 гады з дня нараджэння вядомай рок-спявачкі Ціны Цёрнер. Яна шырока папулярная дзякуючы сваім песням і ролям у кіно. Удзел у дабрачынных міжнародных акцыях «Мы — гэта мір» і «Лайв Эйд» толькі надалі ёй папулярнасці. Аб ёй напісаны некалькі кніг (у тым ліку аўтабіяграфія «Я — Ціна», якая выйшла ў 1986 годзе), сотні артыкулаў, знята некалькі фільмаў.**

**Пісаць аб ёй дастаткова складана, таму наш сённяшні расказ аб тых падзеях, якія не вядомы шырокаму колу прыхільнікаў яе таленту.**

# РАЗБУРЫ ЎСЕ ПРАВІЛЫ

Яе голас электрызуе і заводзіць публіку, сама яна быццам перадае гледачу і слухачу частку той энергіі, якую траціць на сваё непадражальнае дзеянне. Салідныя, рэспектабельныя мужчыны ўпадаюць у такі ж экстаз ад яе песень, як і моладзь у працёртых джынсах і скураных куртках. Яркія выступленні, смелыя тэксты, выдатная пластыка, характэрны голас і манера выканання дазваляюць гаварыць аб тым, што яна — зорка першай велічыні ў сучасным року. І гэта — лепшы тытул для Ціны Цёрнер.

Сёння яе песні і музыку слухаюць ужо, бадай, унукі тых, хто разам з ёй пачынаў сваю музычную кар'еру ў пачатку 50-х гадоў.

Нарадзілася Ціна (сапраўднае імя Эн Мэй Балок) у горадзе Браунсвіл у штаце Тэнесі 26 лістапада 1938 года. У юнацтве спявала ў царкоўным хоры. У 50-я гады яна разам з сястрой Элін пераязджае ў Сэн-Луіс. Сястра і прывяла Эн у клуб «Манхэтэн», у якім пасля шматлікіх візітаў яе заўважыў Айк Цёрнер, арганізатар музычнага рэвю «Каралі рытму». Ён быў настолькі ўражаны вакалам спявачкі, што запрасіў яе прыняць удзел у сваім шоу і дапамагчы ў запісе пласцінкі. У лістападзе 1957 года Эн спявала ўжо кожны вечар у клубе, а хутка нарадзіла і сына. У 1958 годзе запісваецца дэбютны дыск тандэма «Айк—Ціна Цёрнер», а яшчэ праз два гады песня Айка Цёрнера, напісаная спецыяльна для Ціны, разыходзіцца мільённым тыражом. Яна называлася «Заканы дзівак» і мела для Айка прарочы сэнс: музычныя адносіны перараслі ў асабістыя — Айк і Ціна ажаніліся. Цудоўны музыкант, якім з'яўляўся Айк, вырашае пакарыць Амерыку. І гэта яму ўдаецца. Разам з Цінай ён запісвае песню «Гордая Мэры» з рэпертуару «Крыдэнс Кліўотэр Рывайл», напярэдадні зрабіўшы да яе арыгінальную апрацоўку, разлічаную на вакальныя даныя Ціны. У 1971 г. хіт заняў 4-е месца. Гэта быў трыумф. Доўгачаканы і заслужаны. Прыкладна ў гэты час і фарміруецца тая з'ява — Ціна Цёрнер, аб якой дыскусіруюць і па сённяшні дзень.

На канцэртах Айк часта ўзвінчваў музыку да неймаверна высокіх нот, што прымушала Ціну фарсіраваць голас, выцягваючы сваім вакалам «смешкі» мужа. Сама Ціна гаворыць аб гэтым так: «Калі бярэш высокія ноты — міжволі цягнешся ўверх. Пры маім пераходзе на міні-спадніцу гэта камусьці здалося пікантным. Ва ўсялякім выпадку фатографы станавіліся прама пад сцэнай і накіроўвалі аб'ектывы знізу ўверх. Так, здымкі «з-пад спадніцы» сталі маёй візітнай карткай. Калі выступаеш на сцэне — спяваеш і танцуеш, — цела пакрываецца потам, а твар наогул выглядае жудасна...»

Прыкладна ў гэты ж час Айк пачынае калоць наркотыкі і сістэматычна піць. У 1976 годзе Ціна і Айк разводзяцца. Ціна пачынае працаваць сольна. Запісаўшы тры альбомы ў 70-я гады, яна ў пачатку 80-х вырашае некалькі змяніць свой імідж і стыль: «Я аддаю перавагу песням, якія разлічаны на выканаўцу мужчыну... Я люблю, калі ў тэксце ёсць адна або некалькі «стрэмак». З задавальненнем спяваю песні з рэпертуару «Ролінг Стоўнз», Рода Сцюарта, Сэма Кука або Рэя Чарльза. Я шукаю магчымасці ўдасканальвацца ва ўсім, што я раблю».

У 1980 г. выходзіць дыск «Выбух кахання», і Ціна на чатыры гады знікае з поля зроку ўсюдыісных музычных крытыкаў. Яе вяртанне ў 1984 годзе з альбомам «Наёмны танцор» было падобна выбуху: дыск праз паўтара месяца стаў «залатым»... Альбом 1986 года «Брэйн эвра рул» («Разбуры ўсе правілы») змяшчаў абсалютна новы матэрыял і запісваўся з Філам Колінзам, Стывам Уандэрам і Брайанам Адамсам, а праз год выходзіць трайны альбом «Канцэрт у Еўропе», і Ціна запісвае некалькі песень з Мікам Джэгерам. 1988 год азнаменаваўся яшчэ адной выдатнай работай — «Форын Эфеа» — («Замежная справа»), частка песень з якой увайшла ў зборны альбом 1990 года.

У тым жа годзе Ціна Цёрнер заяўляе ў прэсе аб тым, што гэты альбом — апошні і больш яна запісваць музыку не будзе. Гэта было шокам і цяжкім ударам для мільёна яе паклоннікаў.

Але калі лёсу хочацца абмежаваць творчасць Ціны тым, што ўжо запісана ёю і паклоннікі не пачуюць нічога новага, — яна ўсё роўна будзе самай любімай, загадкавай, таленавітай і прыцягальнай каралевай року. Нездарма ж яна казала больш дзесяці гадоў назад: «Я вырашыла, што буду непадобнай на іншых спявачак, і выбіраю песні больш дзёрзкія, чым пластычныя любоўныя балады, якія я магла б выконваць у бальных сукенках і без адзінай кроплі поту...»

**Вядучы рубрыкі —**
**П. БЕСЯЦКІ,**
**асістэнт кафедры рускай літаратуры.**

# КАЛЯДНЫМ ВЕЧАРАМ

**Яшчэ не так даўно тэлевізійныя сюжэты або радыёперадачы на тэмы рэлігійных свят былі сапраўднай рэдкасцю. Амаль не заходзілі ў святыя храмы тыя, хто не верыць у Бога. І зусім іншае становішча цяпер. Пачалося і духоўнае адраджэнне, людзям вернута ўжо многае з таго, чаго ў свой час іх пазбавілі, дазволена тое, што на працягу дзесяцігоддзяў строга забаранялася. Сведчаннем гэтага стала і аднаўленне ў Гомелі дзейнасці сабора Пятра і Паўла. Пры шматлікасці прыхаджан тут праходзіла богаслужэнне, прысвечанае Калядам. Упершыню перад імі выступіла харавая капэла «Дзянніца» з нашага універсітэта пад кіраўніцтвам М. Казлова. Яе прадставіў архіепіскап Гомельскі і Мазырскі Арыстарх і ўручыў яе членам калядныя падарункі. У саборы капэла выконвала духоўныя творы.**



ЗІМОВАЕ ЗАЦІШША.

Фота А. Коваля.

*За бяспеку руху*

# СКАРАЦІЎ НЕ ШЛЯХ, А ЖЫЦЦЁ

...З тралейбуса выйшаў чалавек. На другім баку знаходзіцца патрэбны яму магазін. І хаця да бліжэйшага пешаходнага пераходу трэба прайсці ўсяго некалькі дзесяткаў крокаў, ён вырашыў скараціць шлях.

Пранізліва завісчэлі тармазы. Педаль націснута да канца, але позна. Глухі ўдар і ручаёк крыві марудна папоўз па асфальце з-пад ляжачага чалавека. Адносна хутка прыехала машына «Хуткай дапамогі», але выратаваць пешахода не ўдалося.

Вось так. Чалавек хацеў скараціць дарогу, а ў выніку скараціў сваё адзінае дарагое жыццё. На жаль, аналагічных прыкладаў можна прыводзіць шмат. Так, першы дзень снежня стаў трагічным і непапраўным для двух гамяльчан. Вырашыў скараціць шлях да прыпынку, які знаходзіцца па вул. Уладзімірава, М. П. Якубовіч, але не паспеў, як і ў іншых выпадках, раней перабегчы дарогу і быў збіты аўтамашынай. Медыцына аказалася бяссільнай.

Вечарам таго ж дня начальнік секцыі АТК Гомельскага радыёзавода А. А. Долін вырашыў таксама перайсці праезную частку кальцавой шашы (раён хімзавода) ва неўстаноўленым месцы. Як ніколі ў яго жыцці, гэтая прамая дарога аказалася кароткай. У бальніцы ён пражыў крыху больш 10 гадзін.

Ці думае хто, выходзячы з дому, аб той небяспецы, якая падсцерагае вас на дарозе або на вуліцы?

Наўрад ці. Таму што інтэнсіўны транспартны паток стаў для нас ужо звыклым. Але тым не менш, неасцярожнасць, няўменне, а часам нежаданне падпарадкоўвацца існуючым правілам дарожнага руху, абрываюць чыёсці жыццё.

Так, раз на раз не прыходзіцца. Хацелася б, каб аб гэтым памяталі ўсе. Калі сёння хтосьці перабег дарогу на чырвоны сігнал светлафора, то заўтра такая спроба можа трагічна закончыцца. У такіх выпадках нельга быць раўнадушным. І калі хтосьці можа, побач спыніць парушальніка правілаў дарожнага руху, то зрабіць гэта — яго абавязак.

Статыстыка рэгістрацый дарожна-транспартных здарэнняў бягучай зімы вельмі сумная. Так, толькі за снежань 1991 г. на тэрыторыі г. Гомеля па віне пешаходаў адбылося 40 аварый, у якіх 4 чалавекі загінулі і 43 паранена. Зімняя дарога каварная, і яна не даруе нядбайнасці.

**Л. МАЙСЕЙКОВА,**
**ст. інспектар па прапагандзе аддзела бяспекі дарожна-патрульнай службы ДАІ УУС аблвыканкома.**

*ВЯСЁЛЫ ПЕРАПЫНАК*

# СТУДЭНЦКІЯ АНЕКДОТЫ

Бог кліча анёла да сябе ў пачатку навучальнага года і кажа:

— Пайдзі, паглядзі, як там студэнты вучацца.

Анёл прыходзіць праз некаторы час і кажа:

— Студэнты універсітэта — вучацца, студэнты меда — вучацца, студэнты політэхнічнага — піва п'юць...

У кастрычніку Бог паслаў анёла з тым жа заданнем. І адказ атрымаў той жа:

— Студэнты універсітэта — вучацца, студэнты-медыкі — вучацца, студэнты-політэхнікі — піва п'юць.

Надыходзіць сесія. Дай, думае Бог, пагляджу, як яны да сесіі рыхтуюцца. Паслаў да іх анёла. Вяртаецца той і дае справаздачу:

— Студэнты універсітэта да сесіі рыхтуюцца, меда — таксама рыхтуюцца, а студэнты політэхнічнага — Богу моляцца.

— Ну вось ім мы і дапаможам!

* * *

Студэнт прыйшоў на экзамен дрэнна падрыхтаваны. Прафесар аддаў студэнту заліковую кніжку са словамі:

— У вас не мазгі, а пустыня. Ідзіце і яшчэ займайцеся!

Студэнт узяў залікоўку, схаваў яе ў кішэню і не ўходзіць.

— Што ў вас яшчэ?

— У мяне ёсць заўвага.

— Якая яшчэ заўвага? — здзівіўся прафесар.

— У кожнай пустыні ёсць аазіс, але не кожны вярблюд можа яго знайсці.

## НЕКАЛЬКІ ПАРАД ПЕРШАКУРСНІКАМ

Не спрабуй рабіць выгляд, што ты ведаеш больш за выкладчыка. Лепш, калі ён западозрыць гэта сам.

* * *

Не ўпадай у адчай, калі назва экзамена і выкладчык табе невядомыя. Проста ты не быў у яго на лекцыях.

* * *

Навучыся ўпэўнена сцвярджаць тое, што нельга праверыць, але не будзь упартым, калі якая-небудзь фармулёўка выкладчыку не падабаецца.

* * *

Веды лепш трымаць у кішэні, чым у галаве.


# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ВАКАНТНЫХ ПАСАД ПА КАФЕДРАХ:**

— гісторыі Беларусі — дацэнта;
— беларускай літаратуры — дацэнта;
— гісторыі ўсходнеславянскіх народаў — дацэнта;
— рускай літаратуры — асістэнта;
— матэматычных праблем кіравання — ст. выкладчыка;
— фізвыхавання — выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

Рэктарат.



Рэдактар Ул. БАЛОГА.

**Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.**

**«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельскага дзяржаўнаг універсітэта імя Ф. Скарыны.**

**Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.**

**Спонсары газеты — Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП «Сучасныя тэхналогіі», прафком студэнтаў.**

**Гомельская фабрыка «Палесдрук» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь г. Гомель, Савецкая, 1.**

**Аб'ём 1 друк. арк.**
**Тыраж 1.500 экз.**
**Заказ 14.**

**Падпісана да друку ў 15.00.**